архівы

Натальля Арсеньнева



...

...

# Вучаніца і настаўнік: супраца

Калі ў канцы 2001 — пачатку 2002 году ў “Беларускім кнігазборы” складалі том выбраных твораў Натальлі Арсеньневай, я згадаў, што ў маіх сшытках маюцца перапісаныя лісты паэткі да Антона Луцкевіча. Набраўшы тэксты тых лістоў на кампутары й аддаўшы іх рэдактару Міхасю Скоблу, я вырашыў напісаць пра ўзаемаадносіны паэткі з ейнымі настаўнікамі беларускае літаратуры ў Віленскай беларускай гімназіі — Максімам Гарэцкім ды Луцкевічам. Так зьявіўся нарыс “Вучаніца і настаўнікі”. Пішучы яго, я перагледзеў усе мае запісы ва ўсіх маіх сшытках, зробленыя ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гадоў у знакамітым 21-м фондзе Цэнтральнае бібліятэкі Літоўскае Акадэміі навук, або Віленскім беларускім фондзе, дзе захоўваюцца дакументы з Беларускага музею імя Івана Луцкевіча[1]. І ў сшытку, пазначаным лічбаю

*Падрыхтоўка тэкстаў да друку і каментары Анатоля СІДАРЭВІЧА.*

[1] Калі не памыляюся, у жніўні 1944 г. НКУС Літоўскае ССР забраў з Беларускага музею імя І. Луцкевіча вельмі шмат матэрыялаў. Яны былі вывезеныя ў БССР. Аднак ня менш іх засталося.р

10, убачыў запіс: “Папка 10. Лісты Н. Арс.”. Далей ідзе дата — “Хэлмна, 15 лютага 1929 г.” — і зварот: “Паважаны Пане!” І больш ніякіх запісаў. Толькі праз дзьве старонкі ідуць запісы вершаваных тэкстаў. Запісы скончыліся “Песьняю, пяянай малым фокам”.

І я згадаў: працуючы ў фондзе, вырашыў быў спачатку перапісаць пераклады Арсеньневай з Рэдзьярда Кіплінга, а потым ужо і яе два лісты да Антона Луцкевіча. Ды не пасьпеў: былі трывожныя і гарачыя дні 1991 году. Пасьля крывавых падзеяў у віленскім тэлецэнтры я зьезьдзіў у бібліятэку яшчэ раз ці два, а пасьля замітусіўся ў віры палітычных і грамадскіх здарэньняў, пайшоў працаваць у ліцэй, у якім (замест таго, каб сядзець у архівах) змарнаваў восем гадоў жыцьця, а тым часам быў уведзены візавы рэжым...

Яшчэ жывая была Натальля Арсеньнева, я мог бы напісаць ёй, распавесьці пра свае знаходкі, але каля нашае дыяспары ў Амерыцы круціліся ўвішныя людзі, дый навошта турбаваць немаладую і, пэўна ж, небагатую жанчыну? Карацей, не знайшоўшы дабрадзея, які б аплаціў мне немалыя, як для настаўніка, кошты візаў, паездак, працы ў бібліятэцы і пражываньня ў гатэлі, я махнуў рукою й забыўся на гэтыя запісы. І вось дзякуючы “Беларускаму кнігазбору” згадаў іх.

Аддаючы нарыс “Вучаніца і настаўнікі” ў рэдакцыю “Нашае Нівы”, я намякнуў: някепска было б знайсьці фундатара, зьезьдзіць у Вільню і да 100-годзьдзя Натальлі Арсеньневай падрыхтаваць публікацыю яе лістоў і перакладаў. Але ў “Нашай Ніве” ці то не пачулі мяне, ці то забыліся на мае словы, і справа каторы раз адкладалася на нявызначаны тэрмін. І тут зноў мяне патурбаваў рэдактар Міхась Скобла: напішыце што-небудзь да юбілею паэткі. А што я напішу? Найлепш было б апублікаваць яе лісты і пераклады. І Міхась, дай Бог яму здароўя, спытаўся: а дзе яны? Даведаўшыся пра папку № 10 у 21-м фондзе, ён патэлефанаваў у Вільню нейкай грамадзянцы Літвы (дай Бог і ёй здароўя). Зьезьдзіўшы ў нашу старажытную сталіцу у нейкай сваёй справе, Міхась прывёз адтуль і копіі рукапісаў паэткі.

***

Няволя ёсьць няволя. Мусіць, трапіўшы ў кіпцюры НКВД ў 1939 г., А. Луцкевіч згадваў свае ранейшыя турмы: і Пішчалаўскі замак 1904 г., і Лукішкі 1920-га, і гаўпвахту 2-га аддзелу польскага генеральнага штабу таго ж 1920-га, і Лукішкі 1927-1928 гг. І мог параўнаць рэжымы. І перaканацца: крытыкуючы бальшавізм, ён меў рацыю, бо гэта сапраўды аднаго поля ягада з фашызмам.

У студзені-лютым 1991 году я друкаваў у “ЛіМе” тры артыкулы “З жыцьця Антона Луцкевіча”. Другі з іх меў загаловак “Астрожныя запісы”. У ім я пісаў, што, седзячы ў турме на Лукішках, Луцкевіч інтэнсіўна працаваў. Змесьціва папкі 224, што захоўваецца ў тым самым 21-м фондзе складае агульны сшытак, у якім перапісаная частка перакладу “Кнігаў джунгляў”[2] Рэдзьярда Кіплінга.

---

пКалі літоўскія савецкія ўлады пачалі літуанізаваць Вільню і зьнішчаць сьляды беларускае прысутнасьці ў ёй, Музей падлягаў ліквідацыі, а яго фонды раскідваліся па розных сховішчах, кс. Адам Станкевіч выхопліваў, як з агню, тое што было найбольш каштоўнае. А да а. Адама езьдзіў, як апавядаў мне Янка Брыль, камуніст Валянцін Таўлай, тады супрацоўнік наваствоpанага Музею Янкі Купалы. Так у Музей трапілі рукапісы “Паўлінкі” і незакончанае паэмы “Гарыслава” ды іншыя. матэрыялы. Айцец Адам казаў Таўлаю, каб з Менску прыслалі два “студэбэкеры” ды вывезлі нацыянальнае багацьце. Таўлай хадзіў да старшыні Саюзу пісьменьнікаў Міхася Лынькова, а той толькі адказваў: “Усьпеецца, уюнаш, усьпеецца”. Так і “ўсьпелася”.

[2] Р. Кіплінг напісаў спачатку “Кнігу джунгляў”, потым выдаў “Другую кнігу джунгляў”. Абедзьве яны маюць агульны назоў — “Кнігі джунгляў”. Іншы раз пішуць пра першы і другі тамы “Кнігі джунгляў”, але правільна будзе пісаць і казаць: “Кніга джунгляў” і “Другая кніга джунгляў”.

Пераклад пісаны акуратным, каліграфічным Луцкевічавым почыркам на няцотных старонках сшытку, а на цотных маюцца разнастайныя запісы. У прыватнасьці — план "Чарговыя працы", у якім аўтар паставіў сабе задачаю пераглядзаць і паглыбіць свой ранейшы артыкул аб творчасьці Натальлі Арсеньневай, напісаць паводле гатовага плану пра лірыку Купалы і асобна пра драматургію ("драму") Купалы, напісаць працу "Абдзіраловіч і Барыка" (у дужках пазначана "новае"), перагледзець і дапоўніць успаміны "За дваццаць пяць гадоў", перакласьці "Другую кнігу джунгляў" і Acta Apostolorum.

Пра лірыку (праўдзівей, пра творчасьць Купалы) А. Луцкевіч напісаў і прачытаў на пачатку 1929 г. лекцыю "Напевы ліры Янкі Купалы" (у тым самым годзе яна будзе надрукаваная ў кнізе "Адбітае жыцьцё"). У 1930 г. Луцкевіч першы раз прачытае лекцыю пра Купалу як прарока адраджэньня. І напіша ледзь не паэтычны тэкст да 25-х угодкаў творчасьці Паэта[3].

У турме (у лютым 1928 г.) Луцкевіч накідае фрагмент "Абдзіраловіч і Барыка", а ў 1939 г. выдрукуе ў "Калосьсі" аднайменны артыкул.

Успаміны "За 25 гадоў", сапраўды, былі дапоўненыя тым матэрыялам, пра які аўтар зрабіў нататкі ў турме, і выдадзеныя ў 1928 г. асобнаю брашураю. Праца над імі была скончаная ў турме, бо радок з адпаведным запісам "Чарговых працах" быў перакрэсьлены.

Што ж тычыцць Дзеяў Апосталаў, дык пераклад гэтае кнігі ўбачыў сьвет у 1931 г. — калі па-беларуску быў апублікаваны ўвесь Новы Запавет з Псальмамі. (Дарэчы, у папцы 816-й таго ж 21-га фонду захоўваецца рукапіс перакладу Кнігі Псальмаў, зроблены, найбольш імаверна, Лукашом Дзекуць-Малеем, бо почырк — не Луцкевічаў).

Больш трэба запыніцца на перакладзе "Кнігі джунгляў" Рэдзьярда Кіплінга. Праца над ім ішла ў турме да канца зьняволеньня, бо на апошняй старонцы 221-га сшытку бачым упісаную Лукевічам дату: "21/V. 1928 — Лукішкі".

Пераклад захоўваецца ў папках 221—226 таго самага 21-га фонду. Я бачыў і гартаў агульныя сшыткі з ім. Вось іх зьмест кожнае з папак. У 221-й мы можам прачытаць "Аповесьць слана Газі" і пачатак "Помсты Маўглі", у 222-й папцы перахоўваюцца заканчэньне "Помсты Маўглі", "Рудыя сабакі", "Веснавая пагулянка", "Мэгер з Мэгер-Горту"[4], у 223-й — "Паляваньне Каа" і "Тыгр! Тыгр!", у 224-й — заканчэньне разьдзелу "Тыгр! Тыгр!", "Песьня Маўглі, якую ён пяяў на Скале Рады, скачучы на скуры Шэр-хана", а таксама "Каралеўскі анк" і "Белая Нэрпа"[5], у 225-й — "Рыкі-Цікі-Таві" і "Маленькі Тумай". 226-я папка адрозьніваецца ад сваіх папярэдніц тым, што ў ёй захоўваецца машынапіс з тэкстам "Браты Маўглі".

Такім чынам, мы бачым, што ў агульных сшытках утрымліваецца пераклад шасьцёх раздзелаў (з сямі) "Кнігі джунгляў" і чатырох разьдзелаў (з васьмі) "Другое кнігі джунгляў". Цяпер мне цяжка сказаць, які разьдзел Кіплінгавага твору Луцкевіч назваў "Помстаю Маўглі". Праўдападобна, гэта "Нашэсьце

---

[3] [Луцкевіч А.] Янка Купала (К дваццаціпяцілецьцю яго літаратурнае працы // Наперад! 1930. 3 кастрычніка.

[4] Н. Арсеньнева назвала гэты разьдзел "Грабары".

[5] Можа кінуцца ў вочы, што разьдзел называецца "Белая Нэрпа", а песьні (у перакладзе Арсеньневай) сьпяваюць фокі. Так па-рознаму перакладаюць ангельскае слова *seal*. Цюлені — агульная назва двух сямействаў ластаногіх: сапраўдных цюленяў (Phocidae), якія ня маюць вушных ракавінаў, і вушастых (Otariidae). Нэрпа (Phoca hispida) ёсьць адным з відаў сапраўдных цюленяў. У расейскіх перакладах яшчэ большая разьбежка ў назвах: у адным разьдзел мае загаловак "Белый тюлень", а ў другім — "Белый Котик", хаць Phocidae істотна адрозьніваюцца ад Otariidae. Зрэшты, у польскай мове foka — цюлень, а foki — і цюлені, і коцікавае футра.

джунгляў" з "Другое кнігі..." Затое не магу сказаць які раздзел атрымаў загаловак "Аповесьць слана Газі". Калі вяртацца да статыстыкі, дык можна сказаць, што Луцкевіч пераклаў дванаццаць разьдзелаў з пятнаццаці.

Выйшаўшы з турмы, Луцкевіч, мусіць, працягваў працу над перакладам. Ва ўсякім разе з лістоў Н. Арсеньневай мы бачым, што былі перакладзеныя абодва тамы "Кнігі джунгляў". (Я ўпэўнены, што захаваліся рукапісы і трох разьдзелаў, тут не названых. Іншая справа, што ніхто не шукае іх.)

Луцкевіч скончыў свой пераклад хутчэй за ўсё ў Ракуцёўшчыне, бо, як вядома, пасьля зьняволеньня ён разам жонкаю два месяцы жыў у вёсцы[6]. А далей была падрыхтоўка да друку ўспамінаў "За дваццаць пяць гадоў", кнігі "Адбітае жыцьцё", і, мусіць, на чарзе стаяла "Кніга джунгляў", пра што сьведчыць машынапіс самага першага разьдзелу.

Луцкевіч пераклаў празаічны тэкст Кіплінгавай кнігі, а вось з вершамі ў яго была праблема. Праўда, Луцкевіч спрабаваў сябе ў вершатворчасьці і ў перакладах паэзіі. У прыватнасьці, у тых астрожных запісах захавалася ягонае двухрадкоўе:

Белы кужаль — на ім струйка крыві.
Гэта — сьцяг паняволенае Беларусі[7].

Захоўваецца і пераклад славутага чатырохрадкоўя Авідзія Назона, якое, перш чым перакласьці яго, Луцкевіч выпісаў у свой сшытак на мове арыгіналу. Вось гэты пераклад:

Першы быў век залаты, калі безь ніякай прынукі
У добрае волі сваей шанавалі і вернасьць, і праўду,
Страху прад карай ня знալі, ня чулі слоў грозных законаў
Дый без апекі судзьдзі былі тады людзі бясьпечны.

Пакінуўшы гэты пераклад на суд адмыслоўцаў, адзначу: не перапісаўшы ў свой сшытак лісты Арсеньневай, я ня быў прымушаны ўважліва прыглядзецца да Луцкевічавага перакладу, спраўдзіць, ці ёсьць у тых рукапісах ягоныя пераклады вершаў Р. Кіплінга. Бо калі б перапісваў лісты, змушаны быў бы, высьветліць прычыну, чаму перакладчык выслаў Натальлі Арсеньневай ня ўсе вершы з Кіплінгавае кнігі (на картках, пра якія пісала паэтка). З дакладнасьцю можна сказаць, што Луцкевіч пераклаў адзін верш з "Кнігі джунгляў": "Песьня Маўглі, якую ён пяяў на Скале Рады, скачучы на скуры Шэр-хана". Бо гэты верш — нерыфмаваны.

Хоць побач з ім быў Хведар Ільяшэвіч (нямала вершаў надрукуе ў газеце

[6] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху: Выбраныя творы. Менск, 2003. С. 230.

[7] Друкуючы гэтае двухрадкоўе ў "ЛіМе", я "падрэдагаваў" Луцкевіча: замест "струйка" механічна напісаў "палоска". А нейкі мастак (шкада, ня ведаю ягонага прозьвішча) зьмясьціў гэтыя словы на графічным партрэце Луцкевіча.

[8] У 1999 г. К. Мароз напісаў, што першы водгук на зборнік Н. Арсеньневай "Пад сінім небам" напісаў Уладзімер Самойла, які пад псеўд. М. Чэмер надрукаваў ў кн. 5—6 часопісу "Родныя Гоні" рэцэнзію "Верная дачка Сонца і "Шчырай Зямелькі". Сапраўды, 5-я кніга "Родных Гоняў" датаваная ліпенем-жніўнем 1927 г., аднак насамрэч яна выйшла пазьней. Пра гэта сьведчыць наступнае. У "Bielaruskaj Krynicy" за 5 жніўня 1927 г. можна прачытаць агляд 4-й кн. "Родных Гоняў", у якім гаворыцца: "Апошняй навіной у беларускай літаратуры ў Вільні зьяўляецца № 4 месячніка "Родныя Гоні". Такім чынам, у тыя дні, калі быў напісаны і надрукаваны арт. А. Луцкевіча, выйшла толькі 4-я кн. часопісу, у якой не было рэцэнзіі М. Чэмера на зборнік Арсеньневай. Пра выхад 5-е кн. "Родных Гоняў" "Bielaruskaja Krynica" паведаміла толькі 7 кастрычніка 1927 г. у артыкуле "Адказ на "адказ" (Да палемікі з "Роднымі Гонямі")".

“Наперад!”, што пры актыўным удзеле Луцкевіча выходзіла ў 1929—1930 гг.), былі іншыя паэты, перакладчык палічыў патрэбным папрасіць дапамогі ў сваёй вучаніцы, першае ў той час сярод заходнебеларускіх паэтаў (Уладзімер Жылка паехаў па сьмерць у БССР, а Максім Танк дэбютуе толькі праз чатыры гады). І вучаніца-паэтка прыйшла на дапамогу настаўніку-крытыку. “З прыемнасьцяй” прыйшла: сыны падрасьлі, вольнага часу “аж надта многа”, а працы ў капітаніхі Кушаль няма (дый асабліва не шукалі яе афіцэрскія жонкі: хто-хто, а вайскоўцы ў польскай дзяржаве былі забясьпечаныя добра).

Засталіся рукапісы перакладаў Натальлі Арсеньневай. Гэта 13 аркушаў з вершамі “Кнігі джунгляў” і 11 аркушаў — з вершамі “Другое кнігі джунгляў”.

Засталіся лісты Натальлі Арсеньневай да Антона Луцкевіча, дзякуючы якім мы аднаўляем яшчэ адзін эпізод з жыцьця ейнага настаўніка і даведваемся, калі і як яна працавала над перакладамі з Р. Кіплінга.

Будзем спадзявацца, што нехта з літаратуразнаўцаў возьмецца за гэты сюжэт (пераклад “Кнігі джунгляў”) больш грунтоўна.

Чаму “Кнігі джунгляў” у перакладзе Антона Луцкевіча і Натальлі Арсеньневай не былі надрукаваныя, можна толькі гадаць, але найбольш імаверная прычына — недахоп сродкаў.

**Анатоль СІДАРЭВІЧ.**

**Натальля АРСЕНЬНЕВА**

# ЛІСТЫ ДА АНТОНА ЛУЦКЕВІЧА

*№ 5*[9]
*Хэлмна, 15 лютага 1929 г.*

Паважаны Пане!

Выбачайце, што так доўга дала чакаць на свой пераклад, але шмат на гэта злажылася прычынаў. Па-першае: не было, як гаворыцца, натхненьня, бралася за работу некалькі разоў і нічога не выходзіла, аж нарэшце прыйшоў дзень, у працягу якога ператлумачыла траха [ня] ўсё. Шукала кнігі, каб параўнаць пераклады рускі з польскім і нямецкім, каб быць як найбліжэй арыгіналу. Нарэшце дастала да хаты пераклад польскі і ўдалося пабачыць нямецкі. Для перакладу карысталася, побач з прысланымі мне праз Пана карткамі, польскім выданьне[м] Кіплінга (Бібліятэка Laureatow Nobla, nakladem Wydawnictwa Polskiego, пераклад з арыгіналу P. Mirandola). Пераклад гэты, наскольккі магу судзіць, надта добры.

У кнізе гэтай вершаў зьмешчана шмат болей, чым Пан прыслаў мне да перакладу, напр., у канцы кожнага разьдзелу ёсьць песьня якой у картках няма, гэта, за выняткам 2 песьняў (песьня ваўкоў і песьня малпаў[10])[11]: 1) Песьня малога Маўглі, **2)** Луканон, 3) Так пяяў кравец Дарці, 4) Сіва й Казёлчык[12]; 5) Песьня абазовых зьвяроў падчас парады. Таксама ў тэксьце ёсьць некалькі песьняў болей.

На ўсякі выпадак я ператлумачыла ўсё ў такім парадку, як гэта знаходзіцца

---

[9] Лісту нададзены № 5, таму што гэта пяты з вядомых лістоў Н. Арсеньневай да А. Луцкевіча. Першыя чатыры лісты гл. у кн: Арсеньнева Н. Выбраныя творы. Менск: “Беларускі кнігазбор”, 2002. Правапіс арыгіналу – захаваны.

[10] Н. Арсеньнева тут і далей піша “налпы”.

[11] У арыгінале дужка зачынена пасьля слова “ваўкоў”.

[12] Верш можна было б назваць “Шыва і конік”.

ў польскім выданьні. Такім чынам скончыла ўвесь першы том і сьпяшаюся выслаць, бо й так спазьнілася. Можа й карнавал троха перашкодзіў[13], але трудна[14], як гаворыцца "noblesse obliga"[15].

Другі том пастараюся выслаць як найскарэй, ня маю яшчэ кніжкі, а хацела б мець для параўнаньня, бо пераклад рускі досыць вольны й палагацца на ім адным было б не саўсім добра. Мне здаецца, што польскі тэкст бліжэй да арыгіналу, хоць, праўда, некаторыя вершыкі і тут, і там саўсім падобныя, асабліва вершык "Як удалося табе паляваньне?" проста слова ў слова і ў рускім, і ў польскім перакладзе. У крайнім выпадку, калі ня ўдасца дастаць 2-га тому, пeратлумачу з прысланых картак, там усяго тры вершыкі. Ня ведаю, як удаўся пераклад мне, але ў кожным разе старалася як найлепей. Калі што будзе, ня так як трэба, ці калі Пан будзе ўважаць, што трэба што-небудзь перарабіць, — зраблю зь вялікай прыемнасьцяй.

Прывет ад мужа. Астаюся з шчырай пашанай

Н. Кушаль.

*№ 6*

*<Канец лютага — 5 сакавіка 1929 г.>*

Паважаны Пане!

Сьпяшаюся выслаць вершыкі з II тому "Кнігі Джунгляў". Былі б гатовы многа раней, але я была хворая на грыпу, толькі ў мінулым тыдні ўстала й узялася за працу. Ізноў, як і ў томе I, вершыкаў у кнізе, зь якой тлумачыла, многа болей[16] і ўзноў на ўсякі выпадак пeратлумачыла іх усе. Адзін зь вершаў, прысланых мне Панам як належачы на I тому, тут, у кнізе, зьмешчаны ў другім [томе][17]. Гэта ёсьць "Песьня малога паляўнічага", якой я дзеля гэтага другі раз не пасылаю, толькі першую зваротку, у якой троха перароблены пачатак. Надта хацела б ведаць, ці дайшлі вершы[18], бо пасылала іх звычайным лістом, але хіба не загінулі? На ўсякі выпадак ня нішчу пакуль што робленых алавіком перакладаў. Калі б што было не саўсім добра, з прыемнасьцяй перараблю ці папраўлю, часу маю вольнага аж надта многа, дык нудна.

Астаюся з пашанай

Н. К.

Шчыры прывет ад мужа.

*Падрыхтоўка да друку*
*і каментары Анатоля СІДАРЭВІЧА.*

---

[13] Хутчэй за ўсё гаворка пра калядныя сьвяткаваньні, якія зазвычай заканчваюцца 6 студзеня — на Вадохрышча. Як жонка каталіка і афіцэра Войска Польскага, Н. Арсеньнева мусіла прытрымлівацца грыгарыянскага календару. Ня выключана, што як праваслаўная паводле хросту яна таксама шанавала сьвяточныя дні і паводле юліянскага календару. Ва ўсякім разе згадка пра карнавал дазваляе зрабіць выснову, што тэксты вершаў для перакладу А. Луцкевіч выслаў у Хэлмна перад Калядамі 1928 г.

[14] Мусіць, тут прапушчаныя словы "адмовіцца, ня браць удзелу".

[15] Становішча абавязвае.

[16] Болей, чым на картках, якія Луцкевіч прыслаў Арсеньневай.

[17] У арыгінале: "зьмешчаны ў другім II".

[18] Тое, што Луцкевіч не паведаміў пра атрыманьне перакладаў, трэба тлумачыць вельмі складанымі абставінамі яго жыцьця. Пераклады вершаў з першага тому "Кнігі джунгляў" Н. Арсеньнева выслала 15 лютага — у той час, як яе настўнік рыхтаваўся да новага суда (працэс пачаўся 28 лютага). Магчыма, недзе адразу пасьля гэтага паэтка захварэла на грып, а пераклады вершаў з другога тому зрабіла і выслала ў канцы лютага — самым пачатку сакавіка 1929 г. А 5 сакавіка жыцьцё самагубствам скончыла Луцкевічава жонка. Высылаючы вершы свайму настаўніку, яна яшчэ ня ведала пра гэта, бо інакш нельга раслумачыць, чаму яна не выказвае спачуваньня. Сыходзячы з гэтага, я і датую ліст канцом лютага — пачаткам сакавіка 1929 г.

# Пераклады вершаў Рэдзьярда КІПЛІНГА з “Кнігі джунгляў”

***Разьдзел 1***

Зыходзіць ноч з імглою, туманамі...
Пара жыцьця зьвяроў, пара кажаніх лётаў.
Лясны народ на бой гатуецца з ахвотай —
Прадзіўны час настаў, час бою паміж намі.
Змагайцеся ж, зьвяры, адважна, сьмела, жвава,
Як кажа нам адвечных джунгляў права!
*(Начная песьня ў джунглях)*

**Паляўнічая песьня ваўкоў**

Калі мінулы дзень у хмарах дагарае
І крык казулі чуецца здалёк...
Раз-два, раз-два...
Алень у гушчары начлег сабе шукае,
І чутны кожны крык, і чутны кожны крок,
Тады я йду адзін і чулым вухам
Сачу, сачу за кожным новым гукам.
Раз-два, раз-два...

Калі мінулы дзень у хмарах дагарае
І крык казулі чуецца задлёк...
Раз-два, раз-два...
Збіраюцца ваўкі, — іх грамада чакае,
Выходзяць з гушчароў, паўзуць у мокры лог.
Няясны гул расьце і шырыцца па сьвеце,
У цемры воўк адзін... другі... і трэці...
Раз-два, раз-два...
Калі мінулы дзень у хмарах дагарае,
Наш вой цягучы чуецца задлёк...
Раз-два, раз-два...

Наш лёгкі крок сьлядоў не пакідае,
Праменным днём нам выдаецца змрок.
А мову нашую вялікую, сьвятую
Хай кожны иначы глухой пачуе!
Раз-два, раз-два...

***Разьдзел 2***
**Падарожная песьня малпаў Бандар-Лёгаў**

Месяц сьвеціць бялява, цудоўна
На галіны, гдзе малпы начуюць,
Толькі лісьцейкі шэпчуць над намі.
Ад усіх мы вышэй безумоўна.
Ўсе нас тутка пабачуць, пачуюць,
Мы за ўсіх разумней навакола.

Дык хвастамі гуляйма вясёла!
У калысцы зь зялёных галінаў
Мы будуем вялікія пляны,
Важым прышлыя лёсы народаў,
У лятунках праводзім гадзіны...
Што мы знаем — ня знана нікому.
Мы будуем... Тут раптам зь вярхоўкі
Нам гарэшак зьляціць на галоўкі.
Думкі блутае сьмех навакола.
Ох, хвастамі гуляйма вясёла!

Наша мова й багата й прыгожа,
Штораз новыя гукі ці словы.
Што пачуем, паўторым адразу:
Льва рыканьне, вой воўка варожы,
Песьню птушкі, лясныя размовы,
Шум гальля і зьмяіныя сыкі, —
Словам розныя, розныя зыкі.
Ці ж няпраўда. Спытайце наўкола.
Ах, хвастамі гуляйма вясёла!

Мы вялікай ляцім грамадою
Праз нязнаныя, змрочныя нетры,
З галіны на галіны ў падскоках
Мы сьмяемся ў бары, над вадою,
Цешыць нас кожны скок у паветры.
Дык далей, да нязнанае мэты,
Наша слава задзівіць паўсьвета.
Хай з нас кпяць усе чыста наўкола —
Ах, хвастамі гуляйма вясёла!

***Разьдзел 3***
Як удалося табе паляваньне?

— Ой, вартаваў я ў гушчары да раньня.
Што ты маркотны, ня віджу здабычы?
    — У лесе дзічына, хто ж вольную зьліча?
Дзе ж твая сьмеласьць, адвага і сіла?
    — Ў цёмным бары яна дзесь заблудзіла.
Дзе ж ты ідзеш, у якую дарогу?
    — Сумна памерці у цёмным барлогу.

***Разьдзел 4***
Люлі, мой сынку... У цёмных аблоках
Месяц хавае свой твар белавокі.
Ціха калышуцца морскія хвалі.
Быццам як ты, яны, сінія, спалі...

Хай табе сьніцца ружовае раньне,
Гдзе непатрэбны ні тсрах, ні змаганьне,
Сьпі ж пад каханую песьню матулі!
Люлі, сыночак мой, люлі, ах, люлі...

*(Калыханка фокаў (цюленяў))*

Не, не сьпяшайся на сінія хвалі,
Плаваць ня ўмееш, згінеш у моры.
Злая акула плыве, можа, здалі,
Зьесьць цябе, дзеткі, мы будзем у горы...
Ворагі злыя чакаюць наўкола,
Мусіш, маленькі, ўсяго навучыцца,
Мусіш на сілы й адвагу здабыцца,
Вось паплывеш тады ў мора вясёла!

*(Песьня, пяяная малым фокам)*

**Луканон**

*Песьня — гымн жалобны фокаў (цюленяў)*

На скальным беразе Паўночы,
Дзе вечна б'ецца роспач хваль,
Мільёны фокаў ўдзень і ўночы
У песьнях выліваюць жаль

Яны пяюць аб Луканоне,
Дзе быў нязнаны чалавек,
Дзе сьмех гулў у хваляў звоне,
Дзе плыў шчасьліва зь векам век.

Штодзённа смутак цісьне грудзі,
Штодзённа вочы сьлёзы льлюць,
Бо родны край забралі людзі,
Зьлілі крывёй, памстуюць, б'юць.

А быў як рай: ў сьвятле, ў зіяньні,
Ў ружовых дымах туманоў...
Так кажуць даўнія казаньні.
Хто ж звольніць край праменны зноў?

На скальным беразе Паўночы,
Дзе людзі край зьлілі крывёй,
Мільёны фокаў ўдзень і ўночы
Ўсьцяж крыўдай труцяцца сваёй.

Ты, чайка, ўзьбіся пад аблокі,
Наш смутак Пану занясі,
Скажы, што скора згінуць фокі,
Калі ім помач не дасі.

***Разьдзел 5***

Ў гушчары ў яме сядзіць Наг.
Над ямай Рыкі кажа так:
Цябе я клічу, Наг, на бой,
Ня жыць нам разам, мне з табой!
Зірні мне ў зоры-вочы
(Наг круціцца, ня хоча)
Гатуйся, брат, да бою

(Зіяе Наг лускою)
На сьмерць і жыцьце бой
(Схаплю і будзеш мой)
Ня страшны мне твой яд!
(Так згінуў чорны гад).

**Так сьпяваў кравец Дарці**
*(Ода на чэсьць храбрага Рыкі)*

Ні адзін з вас, дам вам шыю,
Сабе гнёздаў не пашые,
Й ні адзін звас, знаю я,
Не сьпяе вам так, як я,
Гэта слава — чэсьць мая!

Раскажу я вам пяяньнем,
Што тут здарылася сяньня:
Не жыве ўжо страшны Наг,
Што між ваамі сеяў страх.
Гэта здарылася так:
Рыкі сільны, Рыкі сьмелы,
Рыкі рыцар чорна-белы,
Рыкі кінуўся у скок
І, адзін зрабіўшы крок,
Злога гада Нага змог!

Рыкі, шлюць табе падзяку,
Птушкі ўсіх радоў і знакаў:
Ужо ня вернецца назад,
Здох навекі страшны гад,
Разам зь ім — ягоны яд!
*(У гэтым месцы перарваў яму Рыкі,*
*дзеля гэтага рэшта песьні загінула.)*

***Разьдзел 6***

Мы хочам даўнай волі,
Што згінула нам гдзесьці.
Таму, што мусім есьці, —
Трываем у няволі.

Пакуль ня ўстане раньне,
Гуляйма ў братнім коле,
Забыўшы аб няволі,
У лесе на паляне.

Бог Сіва, Пан ветраў, зямлі і нябёсаў,
Пан нашае сьмерці і Пан нашых лёсаў,
На сьвеце даў кожнаму ежу ласкава.
Адным даў Ён мяса, другім — ізноў травы.
Дык кожны — ад мухі да можнага пана —
Хай слухае Сівы уночы і зрана.

Бог Сіва ёсьць Сьветам, а Сьвет — гэта Сіва,
Ўсім нам ён пануе разумна, шчасьліва.
Жывёле даў пашу, аратаму — нівы,
Дзіцяці малому матулю даў Сіва[19].

**Сіва і казёлчык**
*(Песьня, якой матка Тумая закалыхівае дзіця)*

Бог Сіва, Пан ветраў, зямлі і нябёсаў,
Пан нашае сьмерці і Пан нашых лёсаў
На сьвеце даў кожнаму ежу ласкава.
Адным даў Ён мяса, другім — ізноў травы.
Дык кожны — ад мухі да можнага пана —
Хай слухае Сівы уночы і зрана.
Бог Сіва ёсьць Сьветам, а Сьвет — гэта Сіва.
Mahadeo? Mahadeo!
Жывёле даў пашу, аратаму — нівы,
Дзіцяці малому матулю даў Сіва.
Паноў корміць жытам, а просам бядноту,
Дзядзом-жабраком дае рэшткі за цноту.
Тыгр жывіцца быдлам, крумкач чарнакрылы
З ваўком дзеліць косьці і моцныя жылы.

Пан крыўды на сьвеце ня зробіць нікому
Раз Сівава жонка, чаму — невядома,
Звясьці, ашукаць Яго захацела:
Схавала казёлчыка ў сукнях на цела.
Бог Сіва ёсьць Светам, усё чыста ён знае,
Ці ж Сіву кабета адна ашукае?
Так цяжка схаваці каня ці вярблюда,
Казёлчыка лёгка схаваці усюды.

Калі Пан раздаў і абед, і адзежу,
Спыталася жонка: “Ці ўсе маюць ежу?”
“Але, — адказаў, засьмяяўшыся Сіва, —
Усе, нават казёлчык, якога зламіла”.

Зрабілася сорамна жонцы і, жвава,
Пусьціўшы казёлчыка ў польныя травы,
Схілілася жонка з пакорай да Сівы,
Які нам пануе магутна, шчасьліва.
Бо Сіва ёсьць Сьветам, а Сьвет — гэта Сіва,
Бо Сьветам Ён радзіць магутна, шчасьліва.
Ён быдлу даў травы, аратаму — нівы,
Дзіцяці ж малому матулю даў Сіва.

***Разьдзел 7***

Улева, управа

[19] У рукапісе гэтага тэксту і першых сямі радкоў наступнага маюцца пэўныя адрозьненьні. Дык гэты тэкст прыведзены ў адпаведнасьць з сямю радкамі наступнага.

Сьмела, жвава
Шчыльнай, важнай грамадой
Маладыя, удалыя
Ўсьцяж гатовыя на бой!
Кожны зьвер шукае пары
Ур-ра!
Кожны зьвер шукае пары,
Слон, вярблюд і воўча стары.
Йдуць, ідуць зьвяроў мільёны
Ад дажджу у бор зялёны
Ур-ра!

**Песьня зьвяроў у абоз падчас парады**

Сланы:
Асілкі некалі наш гарт насьлядавалі.
І розум, сілу, спрыт ад нас таксама бралі.
Хоць маюць іншыя і капыты, і рогі,
З дарогі нам, сланы ідуць, з дарогі!

Артылерыйскія валы:
Сланы ня любяць куляў граньня
І дым гармат ня ўсмак ім сяньня,
Мы ж на вайне — маўляў араты
Свой плуг — на бой вязём гарматы!

Кавалерыйскія коні:
Забываюцца ўсе сумы,
Калі зь песьняй йдуць драгуны.
Дык гучней, гучней грымі
Марш вайсковы “Bon Dundee!”
Сена, паша — што ўсё роўна —
Рэчай ёсьць для нас галоўнай.
Мкне швадрон, гучней грымі
Наша песьня: “Bon Dundee!”

Мулы горскай батарэі:
Смела, гэй смела, у горы, вышэй!
Ўкола бяздоньне... Ўсё роўна нам, гэй!
Вузкаю сьцежкай пад хмары ідзём,
Славу вайсковую ў хмары нясём.
Сьмела вядуць нас сяржанты на бой,
Кожны цярпліва цяжар цягне свой.
Сцьежкай каменнай мы ў хмары ідзём,
Славу вайсковую хмарам нясём!

Вярблюды:
Сумны лёс, сумны лёс,
Кожны зьвесіў нос...
Кій па скабах скочна грае
Ра-та-та, прыпамінае.

Сумны лёс, сумны лёс

Нас сюды занёс.
Зноў па скбах кій гуляе
Ра-та-та-та выйгравае!

Хор зьвяроў:
Пакорна нясём свае сілы
Ў рабоце цяжкой а нямілай,
Ці ў коонай язьдзе ці у возе
Працуем даўно мы ў абозе.

Трэ слухаць прыказаў...
Праз нас на зямлі б'юцца людзі,
Праз нас ім спакою ня будзе.
Бо цяжка было б ім спраўляцца,
Бяз нас не маглі бы змагацца.
Трэ слухаць заўсёды прыказу,
Хоць можа мы й згінем адразу...
Ці ў коонай язьдзе, ці у возе
Мы службу нясём у абозе,
Паслушны прыказу...

**Канец I тому.**

**II том**

***Разьдзел 1 (Адкуль узяўся страх)***[20]

Выпіў пал пякучы воды,
Зробім, зробім сьвята згоды!
Сонца паліць, пыл нас душыць,
Вецер лісьцьмі не парушыць,
Непатрэбны бойкі, сварy,
Калі ўсе чакаем кары.
Пойдзем мы й на дне даліны
Ўсе сабе даруем віны...
Выпіў пал пякучы воды.
Зробім, зробім сьвята згоды!
А як дождж ізноў пальецца, —
Скончым згоду, й бой пачнецца!
(Вершык на пачатку разьдзелу)

***Разьдзел 2 (Цуд)***

Зямля дрыжэла, Уцячы
Хацелі мы, але спаткалі
Сьвятога, што йшоў к нам з далі[21],
І разам зь ім пайшлі ўначы...
Паводка мкнула па зямлі,

[20] Першы разьдзел "Другой кнігі джунгляў" заканваецца вершам "Закон джунгляў". Яго перакладу няма.
[21] Словы "йшоў к нам з далі" напісаныя над словамі "йшоў к нам з аддалі".

Раўла, б’ючыся аб каменьні.
Мы прынясьлі яму збаўленьне,
Ратунак мы яму далі...
Але пайшоў ён... Кінуў нас,
Забраўшы нашае каханьне...
Цяпер жа йсьці нам на выгнаньне.
Браты яго далі прыказ.
*(Вершык на пачатку разьдзелу)*

**Песьня Кабіра**

Зважыў сьвет у далоні. Заўважыў марноту.
Кінуў славу, багацьце — жыцьця пазалоту.
Хоць калісьці ўладар, — сяньня ў шаце жабрачай
Йдзе байрагі сьвяты сьежкай дзікай, гарачай...
Там, дзе ўецца дарога да даўнай сьвятыні,
Там, дзе рэкі плывуць у глыбокай даліні,
Калі сонца пячэ, калі вецер там плача,
Йдзе байрагі сьвяты сьцежкай дзікай, гарачай.
Як спаткаецца з кім, так маўчком не мінае:
“Бог адзін ёсьць на сьвеце”, — радосна вітае.
Сьвет кабіру — марнота... Ў адзежы жабрачай
Йдзе байраг сьвяты сьцежкай дзікай, гарачай.
Ён імкнецца да праўды, шукае дарогі,
Што вядзе ад душы чалавечай да Бога...
Кінуў славу, багацьце... Ў адзежы жабрачай
Йдзе байрагі святы сьцежкай дзікай гарачай...
*(Песьня ў канцы II разьдзелу)*

***Разьдзел 3(Помста джунглі)***

Няхай між сьцен разбуранае вёскі
Пасуцца сарны, як на сенажаці.
Няхай загінуць назваў адгалоскі,
Мы тутка іх ня будзем спамінаці...
Хай попел аўтары ахвярныя пакрые,
А сьлед з дарог віхор пазамятае.
Ўспамінам чорным час магілу рые
І сьвежаю травой магіла парастае...
Разбураны дамы — гняздо людзкой нязгоды,
Зноў цішыня, прастор, як тут было спрадвеку.
Хай згіне ў джунглі вольнай назаўсёды
Чужы, пракляты сьлед па чалавеку!
*(Вершык у пачатку 3 разьдзелу)*

**Ранічная песьня джунгляў** *(вершык у сярэдзіне 3 разьдз.)*

Настаў пяяньня час вясёлы.
Як ціха... Любата... Наўкола
Стаяць зялёныя гушчары
Й звіняць, зьвіняць прыпеў прасторы:
“Спакой, спакой пазнае той,

Хто джунглі лёс паверыць свой!
Бяз слоў дарэмных[22] кожны,
Што хто пяе, што хто вітае,
Калі ў аблоках, гэт высока
Усходзіць дзень... У змрок, у цень,
У цемру нор! бо птушак хор
Ужо пяе і будзіць бор!

У цемру нор! Бо неба пас
Гарыць сьвятлом, гарыць агнём.
Чырвоны пас, ён здрадзіць нас,
У цемру нор, у бор, бо час,
Каб чалавек, што ночай спаў,
На мейсца нас да працы стаў!

Вятры парвалі туманы,
З усіх бакоў плывуць яны.
Штораз ясьней, штораз відней...
У цемру, гэй, скарэй, скарэй:
Начны спакой пазнае той,
Хто джунглі лёс паверыць свой!
*(Песьню гэту пяяў хор зьвяроў)*

**Маў[г]лі пяе помсту людзям** *(верш у канцы 3 разьдзелу)*

Мы зьнішчым вам вашыя плёны,
Патопчам усё, што вы мелі,
І кветка чырвонай карэлі
Заглушыць ніўя і загоны.
Гдзе сталі вясковыя хаты, —
Там крыльлем кажан залапоча,
Народ мой там прыйдзе уночы
Лічыць вашы горкія страты.
А вораг вам будзе нязнаны,
Хоць страшнай залье вас ракою,
Ваўкі грамадою дзікою
Ірваць будуць вашыя раны.
За вас мы вясною, ў нядзелі
Зьбяром умалотнае збожжа.
У працы на ніве паможа
Нам кветка чырвонай карэлі.
Загтнець усё, што вы мелі,
Мы зьнішчым вам хаты й пасевы,
На нівах павырастуць дрэвы
І горкія кветкі карэлі...

***Разьдзел 4 (Грабары)***

Шакалам сьмярдзючым вы кажаце: “браце”

[22] У арыгінале — “дарэмным”.

Й гіэну ў супольнай прымаеце хаце.
Прасіце ж на баль іх, якраз для іх ежа:
Хтось падліну кінуў, зьбірайце на межах!
*(Вершык у пачатку 4 разьдзелу)*

**Песьня хвалі**
*(Верш у канцы 4 разьдзелу)*

Аб каменьне хваля звоніць,
гасьне дзень чырвоны,
У сьлязах дзяўчына тонець,
Жальбы ціха роніць...

Беланожка маладая,
Чуеш, раіць хваля тая:
"Стой, ня ймкніся ў даль,
Сьмерць жыве між хваль!"

— Любы сьпеў пяе каханьня,
Не прыйду — дык перастане..."
— Стой, дзяўчына, бо глыбіна
Здрадзіць, стой, дзяўчына!

Не, ня йдзі, бо сэрца зводзіць,
Пачакай, ня йрвіся, годзе!
Стой, ня йрвіся ў даль:
Сьмерць жыве між хваль!

— Як ня йсьці, калі ён кліча?
— Будзеш хваляў злых здабычай.
Глянь, віры усюды, кола,
Дзеўча, сьмерць наўкола!

Ўжо ня выплыве зь бяздоньня
Ні назаўтра, ні сягоньня...
Толькі хваля хвалю гоніць,
Толькі хваля звоніць...

***Разьдзел 5***

Ад часаў як сьвет наш існуе, спрадвеку
Ніколі йшчэ досьць не было чалавеку,
Таксама як кожнай жывёле у полі:
Бо хто мае шмат, дык яшчэ хоча болей.
*(Прыказка джунгляў.*
*Вершык на пачатку 5 разьдз.)*

**Песьня маладога паляўнічага**
*(Верш у канцы 5 разьдз.)*

Калі канчае леў над раньнем паляваньне
І малпы ўжо крычаць на дрэвах гдзе-нідзе,

Па джунглях мкнецца цень няясны, зданьне.
Ах, гэта цёмны жах, ён кроў марозіць мне![23]
Нячутна цень зьніжаецца ў лагчыну
І дзіўны шум расьце ў далячыне,
Я ўвесь дрыжу... Зьбялеў, як палатніна.
Ах, гэта цёмны жах, ён кроў марозіць мне.
Калі пануе змрок, а месяц сьпіць у хмарах,
І жрэмле чуткі бор у поўнай цішыне, —
Дыханьне цяжкае ўсьцяж чуецца на твары,
Ах, гэта цёмны жах, ён кроў марозіць мне!
Бяру свой лук, страляю ў цішу ночы,
Страла мо змрок халодны пражане,
Але мая рука ня слухае, ня хоча...
Ах, гэта цёмны жах, ён кроў марозіць мне...
Калі раве між дрэў, шалее ў хмарах бура,
Грыміць страшэнны гром у кожнай старане,
Здалёк нясецца гул яшчэ мо больш пануры, —
Ах, гэта цёмны жах, ён кроў марозіць мне!
Халодны дождж стучыць па травах і галінах,
Зрываючы камлі, паводка зь пенай мкне...
А я кнаю ўвесь... Ня помню дня й гадзіны...
Ах, гэта цёмны жах... ён кроў марозіць мне...

*(Верш гэты з II тому памылкова быў пасланы як належачы да I тому)*

***Разьдзел 6***

Людзі, што з Усходніх Лёдаў, таюць, быццам сьнег вясною.
Просяць цукру, просяць кавы, не турбуюцца цаною.

Людзі, што з Заходніх Лёдаў, крадуць спрытна ўсё накўкола
І купцом ахвотна футры прадаюць, пастаўшы ў кола.

Людзі, што з Паўдзённых Лёдаў, на кітоў далёк палююць,
Прыбіраюць сваіх жонак, толькі хатаў не будуюць.

Мы ж, народ Паўночных Лёдаў, усё мы ведаем і знаем
І адважна варту маем над каханым родным краем!

*(Вершык у пачатку 6 разьдзелу)*

**Песьня варочаючыхся паляўнічых**

*Песьня, пяяная праз паляўнічых, якія заб'юць фоку **Унутры** паўтараюць з прыемнасьцяй і бясконца звароткі гэтае песьні*

Рукі нам млеюць. На футрах сьвежая кроў чырванее,
Сьнег нас засыпаў глыбока.

---

[23] Гэты верш быў памылкова залічаны да "Кнігі джунгляў". У першай рэдакцыі першае чатырохрадкоўе мела наступны выгляд:
Калі выходзіць леў на паляваньне,
А малпы сьпяць на дрэвах гдзе-нідзе,
Па джунглях мкнецца цень няясны — зданьне.
Ах, гэта цёмны жах... ён кроў марозіць мне.

Цягнем здабычу да хатаў з сілай заўзятай, з надзеяй.
Цягнем здалёка...
Выюць цягуча, нуднава аў-а, аў-аў-а, о-га-гам!
Рвуцца сабакі у скоках.
Пугі сьвісьцяць у паветры, скрыпаюць сані з працягам —
Йдзём мы здалёка...
Гэт, паміж сьнегу й ільдзінаў шмат мы гадзін палявалі,
У хвалях хавалася фока.
Доўга мы, доўга чакалі, ў шэрай вадзе выглядалі
Доўга й далёка...

Дзень мы чакалі з кіямі, з вокам уважным, спакойным.
Выплыла... некалькі крокаў...
Мы падпаўзлі і забілі разам, вясёла й ройна
Фоку здалёка.

Рукі зайшліся. На футрах сьвежая кроў чырванее,
Сьнег нас засыпаў глыбока.
Цягнем здабычу да хатаў гучна, вясёла, з надзеяй
Цягнем здалёка!..

Выюць цягуча, нуднава аў-а, аў-аў-а, о-га-гам!
Рвуцца сабакі ў падскоках.
З хатаў выходзяць кабеты, хусткамі трэплюць, бы сьцягам,
Нас так вітаюць здалёка!
*(Верш у канцы 6 разьдзелу)*

***Разьдзел 7 (Рудыя сабакі)***

Ў імя нашых ночаў цудоўных, праменных,
Ў імя нашай пушчы зялёнай а волі,
Ў імя паляваньняў свабодных, штодзённых,
Ў імя нашых ранкаў, спавітых імглою,
Ў імя нашай братняй, супольнае долі,
За нашыя хаты, за нашы спакой, —
Браты, усе разам, на бой!
*(Верш у пачатку 7 разьдзелу)*

**Песьня Хіля**

Ноча цёмная спраўна сляды пахавала...
(Хіль кажа: ўважайце)
Даволі... Канчайце змагаціся з хвалай
(Хіль, варта пярэдняя Хіля).
Я віджу, што ўсюды тут сьвежая страва,
Што б’ецеся ўсе вы заўзята, крывава,
Што кончыцца сьлед ваш сьмяротнай забвай...

Вы, людзі, што пушчу наскрозь прабягалі,
(Хіль кажа: ўважайце)
Што шпаркіх аленяў ў бягу даганялі,
(Хіль, варта пярэдняя Хіля)
Што ў нетрах лятучай нясьліся стралою.
Ня знаючы страху, парою глухою,
Вы тутка нарэшце зазналі спакою.

Зірніце ж, браты, на пабітых, няжывых,
(Хіль кажа: ўважайце)
Я знаў іх магутных, адважных надзіва.
(Хіль, варта пярэдняя Хіля)
Цяпер яны ціха, спакойна паснулі,
Крывёй заплацілі за стрэлы і кулі,
Жыцьцём заплацілі за сьмелыя гулі!

***Разьдзел 8 (Вясеньні бег)***

Адходзіць чалавек, адходзіць назаўсёды,
Хоць нашым братам тут, у джунглі вольнай быў.
Хоць не было між намі й ім нязгоды,
Хоць верыў нам і нас, як брат, любіў.
Адходзіць чалавек, бо па людзях сумуе,
Бліжэй душы яго жыцьцё чужых людзёў.
Кідае нас, хоць плач наўкола чуе,
Хоць плача сам, — кідае нас, братоў!
*(Верш у пачатку 8 разьдзелу)*

**Разьвітальная песьня**
*(Песьню гэтую чуў Маў[г]лі за сабой, ідучы [з] джунглі да хаты Мэсуі)*

***Балю (мядзьведзь)***
Не забывайся, што, як брат,
Цябе вучыў разумных рад.
Таму шануй закон зьвяроў,
Патрэбны роўна й для людзёў.
Стыдайся злога ўночы, ўдзень,
Хадзі ў бары, як лёгкі цень,
З дарогі простай не сходзі,
На сонца й зоры не глядзі.
Не забывайся слоў маіх,
Ня думай думак прыкрых, злых.
Калі ж пакрыўдзіць хто цябе,
Успомні, брат, тады мяне.
Даруй абразу, крыўду й што ж[24]
Схавай спакойна востры нож.
Будзь справядлівы, як багі.
Хай сонца, вецер, лес глухі
На кожны дзень, на кожны пуць
Табе каханьне й ласку шлюць!

***Ка[а] (вуж)***
Помні, злаба — гэта вораг праклят," 
Крыўды нясе нам, цярпеньні а страты,
Сьмерць нам здрадліва гадуе ў крыві,
Памятай: праўдай спакойнай жыві.

[24] Пасьля гэтага слова стаіць пытальнік. Няма ведама, хто яго паставіў.

Ўважна пільнуй кожны шум уначы,
Сілам ня верыш — схавайся, ўцячы...
Ежу няпэўную кінь, не бяры:
Часта празь ежу здыхаюць зьвяры.
Хочаш праспацца, хоць ноч, усёроўна,
Мейсцаў шукай невідочных, спакойных,
Ямаў, годзе вораг ня ўбачыць цябе,
Кроў не пралье ў неразумнай злабе.
Словаў дарэмных ня кідай, ўважай,
Хоць бы й пустціўся ў няведамы край.
Будзь справядлівы ці ўночы, ці ўдзень...
Сонца, і вецер, і пушчы тэй цень,
Хмары і месяц, і плюскат вады
Будуць цябк пільнаваць заўсягды!

***Багэра (пантэра)***
З-за моцных крат, далёка, гэт
Я першы раз зірнула ў сьвет.
Дык, браце мой, ня вер людзям,
Яны нясуць няшчасьце нам.
Глядзі засўёды проста ў даль,
Хай не трымае цябе жаль.
Вер, чалавек — шакала брат,
Не варты жаляў нашых, гад.
Калі пачуеш ад людзей,
Каб разам зь імі йшоў далей,
Каб біў слабых, каб біў малых, —
Маўчы, ня слухай слоў благіх,
Не калаціся, ня кідай
Дарэмных слоў, аб гонар дбай
І ня блудзі у туманах,
Шукай праўдзівы, просты шлях.
Хай сонца, вецер, блеск і цень
На кожны час, на кожны пуць
Табе каханьне й ласку шлюць!

***Усе трое (мядзьведзь, пантэра й вуж)***
Адыходзіш, брат, знікаеш,
Йдзеш, дзе страх гняздо зьвівае,
Глдзе гарыць агонь чырвоны,
Гдзе плугі гаруць загоны.
Новым сьледам мкнешся, ах!
Йшоў тудой калісьці страх!
Але слухай ўночы, ўдзень,
Што лясны шапоча цень.
Знай, зьвяры душой — з табой
У джунглі роднай а густой
І на кожны час і пуць
Табе ласку сваю шлюць!

*(Вершы ў канцы 8 разьдзелу)*

**Канец**